**Танін, А.** [Віктар Якушкін] / А. Танін // Віцебскі рабочы. — 1989. — 21 студзеня. — С. 2.



...Бой быў цяжкім. Душманы выкарысталі колькасную перавагу і выгаднае становішча агнявых пазіцый. Буйнакаліберны кулямёт літаральна не даваў узняць галавы гвардзейцам-дэсантнікам. Вось і першыя страты. І тады ўперад пайшла група разведчыкаў на чале з Віктарам Якушкіным. Выкарыстоўваючы складкі гор, яны патаемна падабраліся да кулямётнага гнязда і знішчылі яго. Шлях у даліну быў свабодны.

А потым многа яшчэ было цяжкіх заданняў камандавання, і заўсёды з гонарам выконваў іх гвардзеец-дэсантнік Віктар Якушкін. За выдатную службу ён узнагароджан медалём «За адвагу».

Прыйшоўшы дамоў, у Віцебск, Віктар не пакінуў заняткаў спортам, якія дапамаглі яму ў свой час несці службу ў Афганістане. Стварыў ваенна-патрыятычны клуб і трэніруе там будучых воінаў.

Прыкметна ажывілася работа па фізвыхаванню ў СПТВ-147, дзе В. Якушкін працуе выкладчыкам фізкультуры. За гатоўнасць прыйсці на дапамогу, працавітасць, за вернасць дадзенаму слову паважаюць Віктара калегі па працы. А ў мінулы чацвер калектыў СПТВ-147 вылучыў Віктара Якушкіна кандыдатам у народныя дэпутаты СССР па Віцебскай гарадской нацыянальна-тэрытарыяльнай выбарчай акрузе № 79. Выступіўшыя на сходзе гаварылі аб кандыдаце: «З ім мы пойдзем у разведку!».

**А. Танін**

**На здымку: В. Якушкін**